Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26

DOI:10.17951/sb.2021.15.291-309
Studia Białorutenistyczne 15/2021 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Inna Kalita / Іна Каліта

Jan Evangelista Purkyně University in Usti nad Labem (Czech Republic)
e-mail: inna.kalita@ujep.cz
https://orcid.org/0000-0003-0005-1425

# Сіні колер ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў і чэхаў

*The Colour Blue in the Paseological Image of the World of Belarusians and Czechs*

*Kolor niebieski we frazeologicznym obrazie świata Białorusinów i Czechów*

**Abstract**

The following article is dedicated to a comparative analysis of the *colour blue* in Belarusian and Czech phraseology. The objects of research are phraseological units with coloronym (*сіні/modrý*). The main goal is to compare the representation of the *colour blue* using both synchronic and diachronic approaches in order to identify equivalents and lacunae and describe their national and cultural specifics. The main comparative method is supplemented by etymological and linguistic-cultural commentaries, the method of continuous sampling of material from significant phraseological dictionaries is also implemented. Observations of the development of phraseological semantics of the *colour blue* confirm the idea of semantic ambivalence of any colour. Phraseologisms in which the *colour blue* is subject to the process of metaphorization reflects the social tendencies created by man. Outdated units prevail in the „blue phraseology" of both languages. Neological tendencies are connected to globalization trends and national realities. The analysis showed that in Belarusian and Czech phraseology blue is not dominant, but in the phraseological stock of both languages, it occupies its niche and carries a specific semantic load. The article is a contribution to the development of phraseological comparative research of Belarusian and Czech, the topic of phraseological representation of blue being compared in these two languages has not been previously examined.

**Keywords**: phraseology, Belarusian language, Czech language, comparative analysis, colour blue

**Abstrakt**

Artykuł został poświęcony analizie komparatystycznej prezentacji *koloru niebieskiego* w białoruskiej i czeskiej frazeologii. Podstawę do analizy stanowią frazeologizmy

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



z koloronimem (*сіні/modrý*). Głównym założeniem było synchroniczno-diachroniczne porównanie frazeologizmów dwóch języków w celu ukazania ekwiwalentów i luk oraz opisanie ich narodowo-kulturowej specyfiki. Wykorzystane zostały metody z zakresu komparatystyki, uzupełnione etymologicznymi i lingwokulturoznawczymi komentarzami, a także metoda ekscerpcji materiału z wielkich słowników frazeologicznych. Badania nad rozwojem semantyki koloru niebieskiego potwierdzają ideę ambiwalentności semantycznej dowolnej barwy. Frazeologizmy, w których koloronim metaforyzował się, odzwierciedlają zjawiska socjalne, których twórcą jest człowiek. W „niebieskiej frazeologii" obydwu języków przeważają jednostki przestarzałe. Neologiczne procesy związane są z trendami globalizacji oraz realiami wewnątrznarodowymi. Analiza wykazała, że zarówno w białoruskim, jak i czeskim języku kolor niebieski nie odgrywa roli dominującej, ale we frazeologicznym zasobie leksykalnym zajmuje swoją niszę i niesie konkretny semantyczny ładunek. Artykuł jest wkładem w rozwój białorusko-czeskiej komparatywistyki w badaniach nad frazeologią, a zaprezentowana w nim analiza porównawcza koloru niebieskiego w języku białoruskim i czeskim nie była dotąd badana.

**Słowa kluczowe**: frazeologia, język białoruski, język czeski, analiza porównawcza, kolor niebieski

**Анатацыя**

Артыкул прысвечаны кампаратыўнаму аналізу прэзентацыі *сіняга колеру* ў беларускай і чэшскай фразеалогіі. Аб'ектам даследавання служаць фразеалагізмы з каларонімам (*сіні/modrý*). Асноўная задача – сінхронна-дыяхроннае параўнанне фразеалагізмаў дзвюх моў з мэтай выяўлення эквівалентаў і лакун, апісання іх нацыянальна-культурнай спецыфікі. У якасці асноўнага выкарыстаны кампаратыўны метад, дапоўнены этымалагічным і лінгвакультурным каментарамі, а таксама метад суцэльнай выбаркі матэрыялу з вялікіх фразеалагічных слоўнікаў. Назіранні над развіццём семантыкі сіняга колеру пацвярджаюць ідэю семантычнай амбівалентнасці любога колеру. Фразеалагізмы, у якіх каларонім *сіні* метафарызаваўся, адлюстроўваюць сацыяльныя з'явы, творцам якіх з'яўляецца чалавек. У „сіняй фразеалогіі" абедзвюх моў пераважаюць устарэлыя адзінкі. Неалагічныя працэсы звязаны з трэндамі глабалізацыі і ўласна нацыянальнымі рэаліямі. Аналіз паказаў, што ў беларускай і чэшскай фразеалогіі сіні колер не з'яўляецца дамінуючым, але ў фразеалагічным запасе абедзвюх моў ён займае сваю нішу і нясе канкрэтную семантычную нагрузку. Артыкул з'яўляецца ўнёскам у развіццё беларуска-чэшскіх кампаратыўных даследаванняў фразеалогіі, прадстаўленая ў ім прэзентацыя сіняга колеру ў міжмоўным супастаўленні дагэтуль не разглядалася.

**Ключавыя словы**: фразеалогія, беларуская мова, чэшская мова, кампаратыўны аналіз, сіні колер

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



## 1. Уводзіны

Цікавасць да вывучэння лінгвістычнай семантыкі колеру ўзнікла адносна нядаўна – першыя працы выйшлі ў 1950–1960-я гг.. Штуршком паслужылі ранейшыя напрацоўкі ў розных навуковых сферах – оптыцы, фізіцы, мастацтвазнаўстве. У 1963 г. быў заснаваны Амерыканскі інстытут колеру (Pantone Color Institute), у 1967 г. утварылася міжнародная Асацыяцыя колеру (AIC – International Colour Association), у 1969 г. выйшла кніга Брэнта Берліна і Пола Кея *Асноўныя колеравыя тэрміны* (Berlin – Kay: Basic Color Terms: Their Universality and Evolution). Прыблізна ў гэты ж час моўную колерасемантыку ў СССР пачалі распрацоўваць Аляксандр Васілевіч, Наталля Бахіліна, Меліціна Барадзіна, Уладзімір Гак, Уладзімір Колесаў, Рэвека Фрумкіна і інш. Даследаванні моўна-семантычных катэгорый колеру ў другой палове XX ст. узніклі на базісе, які быў закладзены ў розных галінах навук, пачынаючы ад старажытных філосафаў і акультыстаў, і пазней працягнены фізікамі, тэарэтыкамі мастацтва і г.д. У XXI ст. назіраецца новы віток цікавасці да вывучэння лінгвістычнай колерасемантыкі, кожная нацыянальная традыцыя мае сваю спецыфіку. У наш час даследчыкаў аб'ядноўвае ўсведамленне колеру як полівалентнага коду культуры, што спрыяе развіццю міждысцыплінарных даследаванняў. У беларускай лінгвістыцы поруч з даследаваннем колерасемантыкі ў мове, фальклоры і культуры (Іна Швед, Міхал Анемпадыстаў, Анжаліка Садоўская, Вольга Ляшчынская, Марына Абрагімовіч), ідыястылях асобных пісьменнікаў (Юры Бабіч, Ірына Струц, Тамара Федарцова, Святлана Лясовіч, Марына Разладава, Алесь Бараноўскі) фармуецца парадыгма вывучэння колеру ў фразеалогіі (Вольга Ляшчынская, Анжаліка Садоўская, Іна Каліта). Адначасова набіраюць тэмп міжмоўныя даследаванні фразеалагізмаў з кампанентамі-каларонімамі – камапаратыўныя студыі становяцца актуальнай задачай сённяшняга дня, таму што „супастаўляльны аналіз фразеалогіі не менш пераканаўча дэманструе яе арэальнае і культуралагічнае адрозненне для многіх рэгіёнаў Славіі" (Mokienko, 2019, s. 225).

Колерам 2020 г. Амерыканскім інстытутам колеру абвешчаны „класічны сіні". З мэтай вывучэння актуальных тэндэнцый у свеце колераў мы абіраем яго ў якасці аб'екта лінгвістычнага даследавання і будзем займацца аналізам фразеалагічнай семантыкі сіняга колеру (*сіні – modrý)* ў беларускай і чэшскай мовах. Наша задача – параўнанне фразеалагічнай рэпрэзентацыі сіняга колеру ў сінхронна-дыяхронным аспекце, выяўленне эквівалентаў і лакун, апісанне нацыянальна-культурнай спецыфікі фразеалагізмаў з сіняй колерасемантыкай.

## 2. Метадалогія

Асноўныя метады, выкарыстаныя ў дадзенай працы, зыходзяць з агульных задач кампаратыўных даследаванняў – аналіз і параўнанне фразеалагічных

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



адзінак (ФА) дзвюх моў, які пры неабходнасці дапаўняецца этымалагічным ці каментаром. Дэскрыптыўны метад дазваляе параўнаць сінхронныя і дыяхронныя аспекты рэпрэзентацыі сіняга колеру. Матэрыялам для аналізу служаць ФА, вылучаныя метадам суцэльнай выбаркі з чэшскіх і беларускіх фразеалагічных слоўнікаў. Пры гэтым улічваецца пэўнае адхіленне – слоўнікі не паспяваюць фіксаваць навейшыя выразы, таму статыстыка ў гэтай сферы мае адносны характар. З мэтай ахапіць актуальны матэрыял мы звяртаемся і да сучасных медый.

Зыходнымі тэарэтычнымі паняццямі з'яўляюцца *фразеалагізм* і *каларонім*.

Фразеалагізм мы разумеем як семантычна цэласную адзінку, якая характарызуецца ўзнаўляльнасцю і мае ўстойлівы характар. Гэта словазлучэнне ці сказ, які мае цэласнае значэнне і валодае экспрэсіўнасцю. Склад фразеалагізмаў розны: мінімальна два словы (у т.л. службовыя), максімальна – сказ. Фразеалагізм уяўляе сабой семіялагічны факт – моўную „скамянеласць" , якая фіксуе пэўны зрэз моўнай свядомасці носьбітаў мовы. ФА выконвае інфармацыйную, ацэначную, экспрэсіўную, эматыўную і эстэтычную функцыі, можа мець варыянты. ФА з'яўляецца адлюстраваннем эстэтычнага ўспрымання рэчаіснасці чалавекам ў пэўную эпоху і з часам можа губляць сваю актуальнасць (Kalita, 2016, s. 6–7). ФА ў сваім складзе ўтрымліваюць багаты шэраг кампанентаў: саматызмы, фітонімы, арнітонімы, іхтыёнімы, каларонімы і г.д. *Каларонім* – гэта стандартная ці субстандартная адзінка (слова ці словазлучэнне), якая нясе семантыку колеру як атрыбута (*белы, чырвоны*), дзеяння (*бялець, зелянець*) і шырокага дыяпазону намінацый: канкрэтнай (*сінь, жаўцізна*), няпэўнай (*серабурамалінавы*); няпэўна-асацыятыўнай (*колеру марской хвалі*); аказіянальнай (сітуатыўнай або кантэкстуальнай). Каларонім – агульнае азначэнне ўсіх простых, складаных і састаўных адзінак, якія абазначаюць першасныя (*чорны, белы, шэры*) і другасныя (*чырвоны, жоўты, сіні*) колеры, іх адценні, назвы няпэўных колераў, у т.л. няпэўна-асацыятыўныя адзінкі розных тыпаў (Kalita, 2017, s. 39). Зыходзячы з прыведзеных дэфініцый, мы будзем разглядаць ФА з усімі тыпамі каларонімаў, якія адлюстроўваюць значэнні сіняга колеру.

## 3. Колькасны склад сініх каларонімаў у беларускай і чэшскай фразеалогіі

У агульным фразеалагічным фондзе адзінкі з кампанентам-каларонімам прадстаўляюць працэнтуальна невялікую групу. Па падліках Анжалікі Садоўскай, у слоўніках Івана Лепешава іх налічваецца не больш за 50 (Sadoŭskaâ, 2018, s. 150). Параўнанне гэтай лічбы з агульнай ФА (7000), прыведеных у двухтомным *Слоўніку фразеалагізмаў* І. Лепешава, паказвае, што ФА з каларонімамі складаюць каля 0,7% агульнага запаса. Далучэнне ўстойлівых параўнаняў да ўласна ФА, магчыма, павялічыць гэту лічбу з невялікім адхіленнем

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



да 1%. Падлік чэшскіх каларонімаў не праводзіўся, але кампаратыўныя студыі рэпрэзентацыі шэрага і цёплых колераў ў беларускай, рускай, чэшскай і украінскай фразеалогіі (Kalita, 2016; Kalita 2017) сведчаць, што пераважная большасць ФА з каларонімам мае міжславянскія (і не толькі) адпаведнікі. Таму каларатыўная фразеалогія ва ўсіх мовах будзе займаць прыблізна аднолькавы аб'ём, але колькасць асобных каларонімаў у агульным запасе каларатыўнай фразеалогіі неаднолькавая, дамінуюць чорны і белы колеры – як сімвалы архетыповай пары суадносін „дабро" і „зло", астатнія каларонімы па-рознаму адлюстроўваюцца ў нацыянальных традыцыях, таксама як і іх колькасць у сінхраніі і дыяхраніі.

Аналіз выбаркі ФА з фразеалагічных слоўнікаў паказаў, што сіні колер у фразеалогіі не з'яўляецца пашыраным, а адзінак з сіняй колерасемантыкай у разглядаемых мовах няшмат. У *Фразеалагічным слоўніку* І. Лепешава – пяць адзінак (*гарэць сінім полымем, на сіні пазногаць, ні сінь-пораху, сіняя панчоха, сіняя птушка*). Лепешаў у сваіх працах зыходзіў з вузкага разумення фразеалогіі, таму адзінкі, якія не адпавядаюць крытэрыям названага падыходу, у яго слоўніку адсутнічаюць, няма там і параўнанняў. Адсутнічае ў беларускіх слоўніках ФА *да пасінення,* якая ўжываецца ў масмедыях і мастацкай літаратуры, у т.л. ў XX ст., напрыклад, у творах Уладзіміра Караткевіча: „Я мучыўся з гэтым доўга. Прыклейваў і прымінаў тыя месцы, дзе былі белыя плямы, і зноў мераў вугал намоткі, і вёў-вёў далей, аж да пасінення" (У. Караткевіч, *Чорны замак Альшанскі*, 1980). (BNK, I).

У слоўніку чэшскай фразеалогіі і ідыяматыкі таксама зафіксавана малая колькасць адзінак з семантыкай сіняга колеру: два дзеяслоўныя выразы: *slíbit/slibovat někomu modré/modrý z nebe, snést někomu modré/modrý z nebe* (SČFI-VS-A-P, 1994, s. 457), адзін – з апорным словам займеннікам *to samý v bledě modrým* (SČFI-VN, 1988, s. 182), адзін выраз – сказ: *Já ho seřežu, až bude modrej*! (SČFI-VV, 2009, с. 493), чатыры параўнанні *(být) modrý jako nebe, oči modré jako nebe, mít oči jako chrpy / pomněnky, mít oči jako studánky* (SČFI-P 1983, s. 222). Аўтары чэшскага фразеалагічнага слоўніка зыходзяць з шырокага разумення фразеалогіі, таму параўнанні асобным томам уваходзяць у склад фразеалагічнага слоўніка.

У абедзвюх мовах уласна ФА (без параўнанняў) налічваецца мала (5 беларускіх/4 чэшскіх). Гэта колькасць умоўная, таму што беларуская і чэшская традыцыі грунтуюцца на адрозных падыходах да паняцця фразеалогія, а таксама ў слоўніках адсутнічаюць навейшыя адзінкі. Сярод выбаркі ФА знаходзім толькі два міжмоўныя эквіваленты: *modrá punčocha = сіняя панчоха* і *modrá krev = блакітная кроў*, абодва выразы запазычаныя, уяўляюць сабой калькі, якія былі прынятыя многімі мовамі свету. Блізкай па семантыцы з'яўляецца толькі адна пара рознаструктурных адзінак *пасінець ад холаду = být zimou celý modrý.*

Другі важны факт, пра які сведчыць выбарка беларускіх і чэшскіх ФА, гэта тое, што ў сучасных мовах адзінак з сіняй колерасемантыкай менш, чым было раней. У агульным аб'ёме „сіняй фразеалогіі" абедзвюх моў колькасна пераважаюць

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



устарэлыя адзінкі. Перш за ўсё пра гэта сведчыць слоўнік І. Лепешава: дзве (*на сіні пазногаць, ні сінь-пораху*) з пяці ФА ў сучаснай мове не ўжываюцца, тое ж датычыцца некаторых беларускіх параўнанняў з кампанентам *сіні*.

ФА з каларонімам *сіні* ў мовах, якія разглядаем, можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп: (1) паводле актуальнасці: устарэлыя, актыўныя, неалагізмы; (2) паводле паходжання: запазычанні, агульнаславянскія, агульнаўсходнеславянскія і ўласна-нацыянальныя; (3) перыферыйныя. У адпаведнасці з асноўным напрамкам нашага даследавання – міжмоўным параўнаннем, усе адзінкі можна аналізаваць з пункту гледжання магчымасці іх падзелу на лакуны і эквіваленты. Структурны падзел ФА для нашай тэмы не з’яўляецца прыярытэтным, таму ў дадзенай працы мы яго не разглядаем.

## 4. Класіфікацыя ФА з семантыкай сіняга колеру паводле актуальнасці

**4.1 Актыўныя ФА** – гэта адзінкі, якія вядомы носьбітам сучаснай мовы, занатаваныя ў слоўніках, ужываюцца ў медыях і мастацкай літаратуры. У ролі каларонімаў у гэтай групе адзінак выступаюць прыметнікі і дзясловы, адзінкам з кампанентам-каларонімам адной мовы ў другой мове можа адпавядаць ФА без кaларoніма ці з іншым каларонімам. Міжмоўныя эквіваленты могуць адрозніваццa па структуры. Беларускім дзеяслоўным ФА ў чэшскай мове адпавядаюць канструкцыі іншага тыпу, напрыклад: *пасінець ад холаду = být zimou celý modrý.* Цікавым прыкладам з’яўляецца пара *seřežat, až bude modrý = збіць на горкі/чорны яблык.* Беларуская ФА ўтрымлівае фітонім *яблык*, а замест сіняга колеру – чорны ці ў якасці сіноніма колеравобраза *чорны яблык* выступае *горкі яблык*, з асноўнай прыкметай ‘смак’.

Да актыўнага запасу ў абедзвюх мовах адносяцца ўстойлівыя параўнанні, якія адлюстроўваюць народныя ўяўленні і асацыяцыі з сінім колерам. У абодвух народаў на першым месцы знаходзіцца параўнанне з небам: *[být] modrý jako nebe – сіні/блакітны як неба.* У чэшскай мове яно з’яўляецца самым частотным, тымчасам для беларускай мовы больш характэрна ўжыванне такіх выразаў, як *чыстае/яснае неба, нябесны блакіт,* якія адпавядаюць ФА *nebe [je] modré jako šmolka* (даслоўна: неба сіняе як сінька).

На другім месцы паводле частотнасці – параўнанні з вадой і кветкамі: *[mít] oči [modré] jako chrpy*; *[mít] oči [modré] jako šmolka*; *[mít] oči [modré] jak nebe*; *[mít] oči [modré] jako pomněnky / čekanka* (вочы сінія як васількі, сінька, неба, незабудкі, цыкорыя) – адпаведнікі беларускіх *вочы як/нібы/быццам васількі/ валошкі, васільковыя/валошкавыя вочы*.

Некаторым чэшскім параўнанням з прыметнікам *сіні* адпавядаюць беларускія выразы без каларoніма, асобныя адзінкі не маюць поўнага эквівалента: *nebe je modré jako chrpa = nebe / obloha je modré / modrá jako šmolka – неба чыстае, ні*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



*хмаркі / на небе ні хмаркі* (ČBFS, 2017, с. 206); *modrý jako čekanka* (даслоўна: *блакітны як цыкорыя*) – *'блакітны як неба'*; *modrý jako šmolka* (даслоўна: *сіні як сінька*) – *'сіні як кобальт'*.

Частотныя чэшскія ФА з каларонімам *сіні – dát/snést/slibovat* (někomu) *modré z nebe* маюць агульны базіс *modré z nebe* (даслоўна: сіняе з неба (сінь неба/ нябёсаў сінь) – 'нешта недасяжнае'), які надзяляе гэтую групу ФА агульным значэннем 'быць гатовым здзейсніць немагчымае'. ФА *slibovat* (někomu) *modré z nebe* (сін. *slibovat hory doly*) з'яўляецца поўным эквівалентам нямецкай *Das blaue vom Himmel versprechen,* але іх беларускі адпаведнік надзелены іншай вобразнасцю і колерам – *абяцаць залатыя горы*. Чэшскай ФА *dát/snést* (někomu) *modré z nebe* адпавядае беларуская ФА без каларонiма *дастаў бы зорку з неба* (для каго) (ČBFS, 2017, s. 137).

Пара ФА *byt modrý závistí – пазелянець ад зайздрасці* паказвае, што адну і тую ж з'яву розныя мовы могуць „афарбоўваць" іншымі, хаця спектральна блізкімі колерамі. Сіні і зялёны – халодныя колеры, але зялёны знаходзіцца бліжэй да цёплага – жоўтага колеру, і ў фразеалогіі часам уступае з ім у сінанімічныя адносіны. З'ява сітуатыўнай сінаніміі спектральна блізкіх – суседніх колераў назіраецца ў славянскіх і неславянскіх мовах. Чэшскай ФА *je to samé v bledě modrém* (даслоўна: гэта тое ж самае ў бледна-блакітным [колеры]) са значэннем 'гэта тое ж самае' – поўнасцю адпавядае нямецкі выраз *(Das ist) Dasselbe in Grün*, але замест сіняга ў ім ужыты зялёны колер.

Такім чынам, у актыўны запас беларускіх ФА з семантыкай сіняга колеру ўваходзяць адзінкі *пасінець ад холаду, блакітная кроў, сіняя панчоха, сіняя птушка* і не зафіксаваны слоўнікамі выраз *да пасінення* (гл. 4.3), у сучаснай чэшскай мове актыўна ўжываюцца адзінкі *je to samé v bledě modrém, byt modrý závistí, slibovat* (někomu) *modré z nebe*, *dát/snést* (někomu) *modré z nebe, modrá krev, modrá je dobrá* (гл. 4.3).

**4.2 Устарэлыя ФА з семантыкай сіняга колеру** ў агульным аб'ёме выбаркі складаюць пераважную частку. У *Фразеалагічным слоўніку* І. Лепешава ўстарэлымі з'яўляюцца дзве з пяці адзінак: (1) *На <сіні/чорны> пазногаць (пазногцік)* – 1. разм. 'трошачкі, ледзь-ледзь'; 2. Ніколі, зусім (не даваць, не дараваць, не рабіць і пад.) (SF-L, 2008, t. 2, s. 153–154); (2) *Ні сінь-пораху* устар. Зусім нічога (няма, не засталося і пад.) (SF-L, 2008, t. 2, s. 395).

ФА *на сіні пазногаць* – першаснае значэнне 'на чорную палоску пад ногцем' мае сінонім *на чорны пазногаць.* Гэта адзін з выпадкаў фразеалагічнай сінаніміі сіняга колеру, дзе сінонімам да яго выступае чорны колер. Іншыя малавядомыя ў наш час выразы фіксуе *Слоўнік беларускіх народных параўнанняў* Таццяны Валодзінай і Ліі Салавей (SBNP, 2011). Як і астатнія колеры храматычнага спектру, сіні асацыятыўна звязаны з парой года. Будучы халодным колерам, ён увасабляе зіму і холад. Устарэлыя ФА, якія не ўтрымліваюць прамога ўказання на холад, перадаюць яго менавіта пасрэдніцтвам сіняга колеру:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



*Пасінець як курыны пуп*. Вілен. Насмешл. Пра замярзанне каго-н., пасіненне яго твару і рук" (SBNP, 2011, s. 336);

*Пасінець/ссінець як гусіны пуп*. Маст., Лаг., Шум., Лоеў. Насмешл. Янкова, 32; SPZB 4, 558 (SBNP, 2011, s. 336);

*Сіні як пуп гусіны*. Насмешл. Пра чалавека, ссінелага ад холаду. Санько, 182 (SBNP, 2011, s. 337);

*Сіні як пуп*. Слуцк. Сержпутоўскі 1998, 289. Тое ж. (SBNP, 2011, s. 337).

Міжмоўнае параўнанне паказала, што ў XIX ст. у чэшскай мове ФА з семантыкай сіняга колеру было значна больш, чым у беларускай. Чэшскі фонд устарэлых выразаў з кампанентам *modrý* (сіні / блакітны) складаецца з наступных адзінак:

*Modrá armáda* (železničáři) (SSJČ-online, 2011) – чыгуначнікі (даслоўна: сіняя армія);

*Dostat modrý* (zast. bílý) *kabát* (být odveden k vojsku) (SSJČ-online, 2011) – быць ўзятым у салдаты (даслоўна: атрымаць сіняе паліто);

*Být v modrém* (zast. bílém) *kabátě*, *nosit modrý* (zast. bílý) *kabát* (dř.) být vojákem (SSJČ-online, 2011) – быць салдатам (даслоўна: насіць сіняе паліто);

*Slavit, držet, světit modrý pondělek/modré pondělí* (nepracovat po dnu volna) (SSJČ-online, 2011) – не працаваць пасля выхаднога дня – нядзелі (даслоўна: святкаваць сіні панядзелак). Першапачаткова „сіні панядзелак" – святочны панядзелак пасля велікоднай нядзелі, у які людзі не працавалі. Пазней ў слэнгу рабочых гэты выраз пачаў ужывацца ў выпадках, калі рабочы не прыйшоў на працу ў панядзелак, ці прыйшоў, але не мог працаваць – прычыну звязвалі з алкаголем. Поўны эквівалент чэшскай ФА ёсць у нямецкай мове – *Blauer Montag*;

*Dali mu modrý arch, dostal modrý arch* (zast.) (byl dán do výslužby) (SSJČ-online, 2011) – быць прызваным у армію (даслоўна: далі яму/атрымаў сінюю кніжку);

*Ten se naplatí, až bude modrej* (ob. expr. – mnoho) (SSJČ-online, 2011) – 'будзе шмат плаціць' (даслоўна: будзе плаціць аж да пасінення);

*Modrý kříž* (dř.) voj. (označení skupiny bojových chemických látek) (SSJČ-online, 2011) – азначэнне групы вайсковых хімічных рэчываў (даслоўна: сіні крыж).

Слоўнік Францішка Котта, які выйшаў у XIX ст. (1878–1893), утрымлівае ФА, большасць з якіх сучасным носьбітам чэшскай мовы невядомая. З прыведзеных у ім сініх каларонімаў у наш час ужываюцца: гастранамічная намінацыя *Na modro rybu vařiti* (у сучаснай мове – *ryba/kapr na modro*), выраз *Do modra* (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 1, s. 1058) – 'да пасінення', і *Slibovati někomu m. s nebe* (něco nemožného) (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 6, s. 1019) – 'абяцаць немагчымае'.

Да ўстарэлых адзінак, змешчаных у слоўніку Ф. Котта, адносяцца:

*Bylo jich tam až m.* (mnoho) (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 6, s. 1019) (даслоўна: было іх там аж сіня) – шмат, 'як маку';

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



*Nemudrujme do modra (marně).* Šml. IX. 284. (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 9, s. 0169) – (даслоўна: не мудрыць да пасінення) – 'не рабіць нешта дарма';

*Neberu to z modra, co ti povídám* (nevymýšlím si toho) (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 9, s. 0169) – (даслоўна: не бяру гэта з сіняга) – 'не прыдумляю гэта';

*Bylo viděti, že jí do modra nechválil* (nadarmo). Sá. Pr. m. I. 102. (ČNSKott, 1878–1893, Sv. 10, s. 1084) – (даслоўна: не хваліць да пасінення) – 'не хваліць дарма'.

Nemyslete, že *mluvím do modra* (bez rozmyslu) (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 10, s. 1084) – (даслоўна: не балбатаць да пасінення) – 'не балбатаць абы што/не думаючы'.

Má *m. oči jako obloha* (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 8, s. 0213) – (даслоўна: мець блакітныя вочы як неба).

*M. Pondělek* (ČNSKott, 1878-1893, Sv. 1, s. 1058) – (даслоўна: сіні панядзелак).

Яшчэ адной крыніцай чэшскіх устойлівых выразаў з кампанентам *сіні*, большасць з якіх таксама адносіцца да ўстарэлых, з'яўляецца кніга Яраслава Заоралека *Народныя выслоўі* (*Lidová rčení*, першае выданне – 1947 г.), у ёй зафіксаваныя такія адзінкі:

*Je mu modro = je mu blaze*; má se dobře (LR, 2009, s. 196) – (даслоўна: яму сіня) – 'у яго ўсё добра';

*Mudrovat do modra*, t. zbytečně, nazdařbůh (LR, 2009, s. 196) – (даслоўна: мудрыць / думаць да пасінення) – 'выдумляць, думаць зашмат / залішне';

*Lakovat* někoho *na modro* = šidit, klamat, balamutit ho (stud. slang) (LR, 2009, s. 196) – (даслоўна: лакаваць / пакрываць / барвіць некага ў сіні колер) – 'падманваць некага', 'баламуціць' (студэнцкі слэнг).

Выраз з кнігі Я. Заоралека *Zmalovat* někoho *na modro* = nadělat mu modřin (LR, 2009, s. 197) (збіць на горкі яблык) актыўна ўжываецца і ў сучаснай чэшскай мове.

У абедзвюх мовах устарэлых ФА з сіняй колерасемантыкай больш, чым актыўных. Слоўнікі сведчаць пра тое, што ў XIX – пачатку XX стст. колькасць ФА са значэннем сіняга колеру была вышэйшай, асабліва ў чэшскай мове. Нягледзячы на тое, што сіні колер у сучаснай беларускай і чэшскай фразеалогіі не з'яўляецца пашыраным, а большасць адзінак з каларонімам *сіні* адносіцца да ўстарэлых, у сучаснай фразеалогіі абедзвюх моў сіні колер займае сваю нішу і нясе канкрэтную семантычную нагрузку.

### 4.3 Фразеалагічныя неалагізмы з семантыкай сіняга колеру

Неалагічныя тэндэнцыі ў адлюстраванні сіняга колеру ў фразеалогіі сілкуюцца з дзвюх крыніц: трэндаў глабалізацыі і ўласна нацыянальных рэалій. Адбіткам працэсу глабалізацыі з'яўляецца адносна новая перыферыйная ФА, агульная для славянскіх і неславянскіх моў – *дзеці індзіга – indigové děti* (аўтар Нэнсі Энн Тэпп). Выраз лічыцца псеўданавуковым тэрмінам і азначае адораных дзяцей новага стагоддзя з асаблівай аўрай цёмна-сіняга колеру.

У чэшскай мове з канца XX ст., дзякуючы музычнаму гурту „Žlutý pes" (жоўты сабака), пачаў ужывацца выраз *modrá je dobrá* (даслоўна: сіні – добры колер). Песню з такой назвай гурт выканаў у 1998 г., з таго часу выраз *modrá je dobrá*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



ператварыўся ў своеасаблівы выклічнікавы фразеалагізм, якім падкрэсліваюць пазітыўнае стаўленне да сіняга колеру, згоду набыць рэч сіняга ці блакітнага колеру, пафарбаваць нешта ў сіні/блакітны колер.

Літаральна ў наш час у чэшскай мове адбываецца даместыкацыя новага выразу *modrá lež* – калька з англійскай (*blue lie* – сіняя/блакітная хлусня), якую чэшскі псіхолаг Тамаш Новак называе *фарбай маніпуляцыі* (Novák, 2019, I). Гэтым тэрмінам ўзбагаціла палітычны слоўнік Амерыка.

„Сіняя/блакітная" хлусня – тэрмін амерыканскай псіхалогіі, які азначае нявінную, наіўную ману і характарызуе дзіцячыя паводзіны. Дзіця дзеля дасягнення свайго імгненнага жадання ці выхаду з непрыемнай сітуацыі нешта выдумляе і выдае гэта за праўду. У англійскай мове ўжываюцца тэрміны „сіняя/блакітная", „белая" і „чорная" хлусня; „белая" – хлусня бескарыслівая, бяскрыўдная, яна праяўляецца ў дзіцяці ва ўзросце да сямі гадоў, калі спрацоўвае пачуццё спагады; „чорная" – наўмысная, карыслівая мана. Па меры сталення ў дзяцей развіваецца здольнасць гаварыць няпраўду ад імя сваёй групы, гэта спосаб атрымаць перавагу перад іншай групай. Ва ўзросце 11 гадоў дзеці здольныя хлусіць матывавана, ці сацыяльна абумоўлена – так узнікае „сіняя/блакітная" хлусня. Сацыяльны фактар стаў асновай для пераносу тэрміна ў медыйную сферу, якая рэпрэзентуе псіхалагічны ўплыў „сіняй/блакітнай" хлусні як палітычна матываваны фальш (Naprawa, 2017, I).

Псіхолагі падкрэсліваюць, што ў „сіняй/блакітнай" хлусні ісціна не закапаная глыбока, яна знаходзіцца на паверхні, але калі нехта гаворыць няпраўду ад імя групы, людзі ў групе згаджаюцца і гэта іх знітоўвае. Роля дарослага ў стварэнні „сіняй/блакітнай" хлусні – гэта не абсалютная мана, але своеасаблівая індывідуальная інтэрпрэтацыя сітуацыі, якую індывід распаўсюджвае на больш шырокае сацыяльнае кола. Тэрмін псіхологіі выкарыстоўваецца ў англійскіх медыях для характарыстыкі паводзін палітыкаў, з такім значэннем ён адаптуецца ў чэшскай псіхалогіі і прыстасоўваецца да чэшскіх рэалій: „Líbí se mi termín modrá lež. Je to velkolepé nařčení z něčeho, o čem všichni vědí, že je to blbost. Ale stoupenci psychopata, který je v čele smečky, tomu všemu věří. Je to vlastně způsob tmelení příznivců" (Honzák, 2019, I). Радкін Гонзак тлумачыць: сінюю/блакітную хлусню выкарыстоўваюць псіхапаты, якія імкнуцца да ўлады альбо маюць моц, каб праверыць і ўмацаваць лаяльнасць групы прыхільнікаў, і адначасова запэўніць апанентаў, што яны будуць рабіць тое, што захочуць. Гэта хлусня – без сумневу. Напрыклад, плёткі, якія Трамп распускаў пра Клінтана і г.д. (Honzák, 2019, I).

У аснову семантыкі тэрміна, ўзнікненне якога адносяць да 30-х г. XX ст., пакладзена манера паводзін амерыканскіх паліцэйскіх, якія заўсёды дасведчылі адзін аднаму, што на самой справе яны „толькі абараняліся", а „сіняя" семантыка звязана з колерам паліцэйскай формы. Цяпер выраз „сіняя/блакітная хлусня" азначае пустую прэзідэнцкую балбатню, якая б'е ў вочы абуральнай бессэнсоўнасцю, і якую можна лёгка абвергнуць, але, як ні парадаксальна, прыхільнікі прэзідэнта ў яе свята вераць (Honzák, 2017, I).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



Усходнеславянскія мовы не карыстаюцца „каляровымі тэрмінамі” азначэння маны, але такі тэрмін існуе ў польскай мове – *kłamstwo niebieskie*.

> Kłamstwa mają też inne kolory, na przykład są niebieskie kłamstwa. Niebieskie kłamanie zachodzi wtedy, gdy chcemy się komuś przypodobać, najczęściej jakieś grupie ludzi, z którą coś nas wiąże. Wtedy nader chętnie wypowiadamy zdania, które nie mają nic wspólnego z rzeczywistością. (…) Niebieskie kłamstwo występuje też w wymiarze mikro, pomiędzy dwoma osobami, co Francuzi nazywają folie à deux. Współcześnie, w sferze internetu szczególnie, niebieskie kłamstwo zwane jest fake newsem. (Piróg, 2019, I).

У беларускай мове новых ФА з каларонімам *сіні* ў апошні час не ўзнікла, але брыняе і набірае новы палітычны сэнс выраз *да пасінення*. Актуалізуецца ён у кантэксце апошніх падзей у Беларусі, звязаных з перадвыбарчай прэзідэнцкай кампаніяй і мірнымі пратэстамі. Гэты выраз не зафіксаваны ў беларускіх слоўніках, але ёсць у Беларускім N-корпусе.

> Біліся, змагаліся да пасінення, часам страчваючы прытомнасць ад непамернасці таго, што ўсклалі на сябе (Казько, Віктар Афанасьевіч. Суд у Слабадзе: аповесць/Віктар Казько. Мінск: Сталія, 2003) (BNK).

> – Значыцца, жывы, курылка! – усцешана зрабіў выснову Куляшоў. – У Мінску мы змагаліся з ім да пасінення. Выйграць у яго даволі-такі складана (…) („Звязда”. *Ход канём дыпламата Верасава*) (BNK).

У наш час выраз набірае сілу. Ён часта гучыць з вуснаў Аляксандра Лукашэнкі (часцей па-руску) – пра самога сябе, далей ідзе ланцужковая рэакцыя: журналісты перадаюць сказанае Лукашэнкам, выраз агучваецца народам і ўжываецца пераважна для характарыстыкі асобы, якая „падала” яго журналістам. У беларускамоўных і рускамоўных медыях Беларусі гэты выраз часта характарызуе падзеі, тым ці іншым чынам звязаныя з палітыкай Лукашэнкі.

> І Беларусь, і сусветная эканоміка, вядома, адчуваюць спакойнае дыханне Кітая і разлічваюць на адзін пояс Новага шаўковага шляху – бо гэта шлях развіцця, а не той, што задушвае грамадства і бізнес, зацягнуты да пасінення, пояс эканоміі (tvr.by, 2017, I).

> Чвэрць стагоддзя аўтарытарныя рэжымы Беларусі і Расіі з пенай у роце даказвалі, што спорт «вне политики». У гэтую дудку аж да пасінення дзьмулі правіцелі, спартыўныя чыноўнікі, трэнеры і самі ўдзельнікі спаборніцтваў (Zakonnìkaŭ, 2019, I).

> (...) Бесчалавечнасць, беззаконне, жаданне да пасінення трымацца за ўладу і бясконца за кошт суседзяў пашыраць свае тэрыторыі (Âkìmovìč, 2017, I).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



Адзначым, што *да пасінення* – адзін з любімых выразаў А. Лукашэнкі, які ён перыядычна выкарыстоўваў амаль перад кожнымі выбарамі.

> Лукашенко заявил, что не будет держаться за кресло президента до посинения (segodnya.ua, 2014, I).

> «У меня не стоит вопрос любой судьбой уцепиться до посинения за это кресло и держаться. Я уже всего наелся, мне хватило», – заявил Лукашенко, представляя нового премьер-министра страны Андрея Кобякова (segodnya.ua, 2014, I).

> Выступая перед журналистами в Минске, Лукашенко сказал, что было бы глупым менять конституцию в преддверии президентской кампании и добавил, что не будет держаться за власть, если народ не поддержит его. 65-летний глава государства заявил, что не будет «до посинения пальцев» держаться за своё кресло (Radio Svoboda, 2019, I).

У кантэксце перавыбараў гэты ж выраз быў ужыты Лукашэнкам ў дачыненні да Прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна: „Путин, несмотря на наличие такой возможности, не останется президентом до 2036 года и «не будет держаться посиневшими руками за власть»" (RBK, 2020, I). Палітолаг Дзмітрый Балкунец пра парламенцкія выбары 2019 г. піша: „Хоть он и отрицает, что не будет до посинения находится у власти, тем не менее это означает, что он будет находится у власти до последнего момента" (IA REGNUM, 2019, I). Такім чынам, семантыка *да пасінення*, набывае не толькі часова неакрэсленае значэнне *трымацца да самага канца*, але, магчыма, і значэнне 'трымацца да смерці' (у 2036 г. Пуціну будзе 84 гады). Прыклады паказваюць, што калі размова ідзе пра прэзідэнцкія выбары, да базіснай адзінкі *да пасінення* далучаюцца ўдакладняючыя саматычныя кампаненты *рукі* і *пальцы*, а беларускія каментатары ў якасці сіноніма да „*сініх пальцаў Лукашэнкі*" ўжываюць „*чорныя пальцы*" (*Ужо пальцы, якімі Лукашэнка трымаецца за ўладу, не сінія, а чорныя*).

*Да пасінення* – ФА, дакладны сэнс якой залежыць ад дзеяслова (*трымацца, сядзець, поркацца, біць, спрачацца, квасіць, даказваць, плёскацца, купацца, зубрыць*). Адзінка перадае як прамыя значэнні – 'пасінець' ад холаду, ад купання ў халоднай вадзе; так і метафарычныя: рабіць нешта доўга і 'заўзята', 'апантана', 'закасаўшы рукавы', 'не шкадуючы сіл', 'упарта', 'да апошняга', 'да поўнай знямогі', 'выкарыстаўшы ўсе магчымасці'.

Значэнне аналагічнага чэшскага выразу *do modra* таксама фармуецца дзеясловам, напрыклад, (*se)řezat domodra* – '(з)біць да пасінення' *(на горкі яблык), zmrznout domodra – пасінець ад холаду.*

> Dokud ji táta nezačal doma řezat domodra, dokud ji nezačal mlátit, až jí tekla krev (Pierre, D. B. C. (2005): Vernon Bůh Little. Překlad: Petrů, David. Praha: Odeon) (ČNK).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



> Později k nim prý přibyli další: zmrzlí domodra (Grass, Günter (2005): Jako rak. Překlad: Stromšík, Jiří. Brno: Atlantis) (ČNK).

У сучаснай чэшскай мове *do modra* часцей азначае менавіта афарбоўку нечага ў сіні колер, у беларускай мове ў 2020 г. *да пасінення* становіцца сімвалам супроцьстаяння ўлады народу, выразам, які азначае нежаданне А. Лукашэнкі пакінуць прэзідэнцкі пост.

## 5. Класіфікацыя ФА з семантыкай сіняга колеру паводле паходжання

**5.1 Запазычаныя ФА** – чэшска-беларускія поўныя эквіваленты з семантыкай сіняга колеру вядомы таксама іншым славянскім і неславянскім мовам:

*modrá punčocha = сіняя панчоха* – ‘непрывабная жанчына, якую больш за ўсё цікавяць дзелавыя, навуковыя заняткі’ (SF-L, 2008, t. 2, s. 177). Гэты малачастотны выраз – кальку з англ. м. (blue-stocking) чэшскія слоўнікі прыводзяць з паметай устарэлае.

*Modrá krev = блакітная кроў* (калька з франц. м. – aiseau bleu) – ‘чалавек знатнага паходжання’. У дадзеным выпадку ў беларускай мове выкарыстоўваецца прыметнік *блакітная.* Да месца будзе прыклад удалай перыфразы Ларысы Геніюш з верша *Нёмне* (1939 г.): *кроў сіняя любай краіны* – у якой пад кроўю падразумяваецца нёманская вада, а сам Нёман апісваецца паэткай ўсімі адценнямі сіняга: „Гэй, Нёмне шырокі, як лён галубы! // Кроў сіняя любай Краіны! // Вясёлы ля берагу, строгі ў глыбі, // як вочы дзявочыя сіні!” (Genìûš, 1967).

У слоўніку І. Лепешава, акрамя пералічаных ФА з кампанентам *сіні*, зафіксаваны выраз *сіняя птушка* – ‘сімвал шчасця; тое, што ўвасабляе для каго-н. найвышэйшае шчасце’ (SF-L, 2008, t. 2, s. 270). Гэта запазычанне вядома ўсходнім славянам, але ў чэшскай мове яго няма.

**5.2 Агульнаўсходнеславянскія адзінкі ў складзе беларускай фразеалогіі**

Да агульных усходнеславянскіх адзінак можна аднесці *гарэць сінім полымем (агнём)* – 1. Знаходзіцца пад пагрозай невыканання, зрыву; 2. Псавацца, станавіцца непрыгодным (SF-L, 2008, t. 2, s. 300). ФА ўжываецца ў рускай (*Гори [оно всё] синим пламенем!*) і украінскай (*Гори воно синім полум'ям*!) мовах.

**5.3 ФА праславянскай эпохі**

Фразеалагізм *на сіні пазногаць/пазногцік* доўгі час разгладаўся як агульнаславянскі. І. Лепешаў дае наступную этымалагічную даведку: „У такой форме фразеалагізм ужыв. ў бел. м. паралельна з выразам ні на ногаць і абазначае ‘трошачкі, ледзь-ледзь’” (ESF, 2004, s. 241). Аналагічныя выразы сустракаюцца ў пскоўскіх, пячорскіх, букавінскіх гаворках – такая геаграфія, на думку Мікіты

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



Талстога, дае права адносіць ўзнікненне ФА да праславянскай эпохі. Валерый Макіенка са спасылкай на слоўнікавы матэрыял пераканаўча паказвае, што гіпатэтычна праславянскае пры дэталёвым аналізе можа мець больш глыбокія карані і аказацца агульнаіндаеўрапейскім ці нават настратычным. ФА *на сіні пазногаць/пазногцік* прысутнічае ў моўнай гісторыі цюркскіх і еўрапейскіх моў. У нямецкай мове: *j-m nicht das Schwarze unter dem Nagel* (unterm Fingernagel, unter den Nägeln) *gönnen* значыць 'шкадаваць нават дробязі', *nicht das Schwarze unter dem Nagel* (unter den Nägeln) *haben* – 'не мець абсалютна нічога'; у нямецкім маўленні (у т.л. дыялектным) вядомыя і іншыя варыянты выразу – напр., *einem das Weiß von Nagel geben* – 'абсалютна нічога не даць', *was ufme Nagel hebt* – 'вельмі мала' і інш., што сведчыць пра яго старажытны і спрадвечны характар у германскай моўнай прасторы. Несумненна пры гэтым, што і славен. *koliko je za nohtom črnega*, серб./харв. *koliko crno iza ispod nokta* таксама адносяцца да спрадвечна славянскага фразеалагічнага фонду, бо развіваюць, па назіраннях Янэса Кебера, актыўную варыянтнасць (Mokienko, 2019, s. 228).

### 5.4 Уласна-нацыянальныя этназначымыя ФА

У якасці беларускага этнафразеалагізма можна разглядаць *збіць на горкі / чорны яблык.* Ён не ўваходзіць у групу беларускіх адзінак з кампанентам сіні, але з'яўляецца адпаведнікам чэшскай ФА з сіняй семантыкай – *seřežat, až bude modrý*. Адпаведнікі гэтай беларускай ФА маюць іншую структуру і ўтрымліваюць каларонімы: рускі *избить до посинения, живого места не оставить* = украінскі *побити мало не до смерті (до півсмерті)* = англійскі *beat black-and-blue* (сіні і чорны) = нямецкі *Jemanden grün und blau Schlagen* (зялёны і сіні).

Да ўласначэшскіх адзінак належыць выклічнікавы фразеалагізм *modrá je dobrá.* Звычайна выклічнікавыя ФА не маюць аналагаў у іншых мовах, паколькі „нараджаюцца" ў нацыянальным кантэксце і адлюстроўваюць ацэнку і эмоцыі праз „прызму" асобнай нацыі.

## 6. Перыферыйныя ФА

Пад фразеалагічнай перыферыяй мы разумеем устойлівыя адзінкі тэрміналагічнага характару, якія не ўваходзяць у фразеалагічнае ядро, і якія не ўсе навукоўцы адносяць да ўласна фразеалогіі. Гэтыя адзінкі не з'яўляюцца традыцыйна-літаратурнымі, сфера іх ужывання – публіцыстыка, навукова-папулярная аналітыка. Сярод такіх адзінак шмат запазычанняў, якія з аднолькавым значэннем ўжываюцца ў славянскіх і неславянскіх мовах. Да перыферыйных ФА адносяцца, напрыклад, *зялёны турызм, шэрая эканоміка,* таксама адзінкі, якія атрымалі назву „палітычная фразеалогія" (*служыць свайму народу, слуга народу, масавая аўдыторыя, праць/адмываць брудныя грошы*). У сучасных мовах найбольш пашыранымі каларонімамі, якія ўваходзяць у склад ФА, з'яўляюцца

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



кампаненты *шэры* і *зялёны*, першы ў скадзе ФА азначае напаўлегальныя з'явы ў светавай эканоміцы, другі – экалагічны падыход да рэсурсаў.

Разглядаемы намі *сіні* колер у наш час цалкам фразеалагічна „бедны”, таму і на фразеалагічнай перыферыі сустракаюцца адзінкавыя прыклады – гэта зусім новая для чэшскай мовы запазычаная адзінка *modrá lež*, а таксама запазычанне з няўласна-сінім каларонім *дзеці індзіга – indigové děti*, якое ўжываецца ў абедзвюх мовах.

## 7. Чэшска-беларускія міжмоўныя эквіваленты

Чэшска-беларускія міжмоўныя эквіваленты прадстаўлены запазычаннямі *сіняя панчоха – modrá punčocha, блакітная кроў – modrá krev* і *дзеці індзіга – indigové děti.* Да агульных семантычных пар можна аднесці *пасінець ад холаду – být zimou celý modrý*; параўнанні *сіні як неба – modrý jako nebe*; *mít oči modré jako chrpy – вочы як/нібы/быццам васількі/валошкі, васільковыя/валошкавыя вочы*; а таксама выраз *да пасінення – do modra (domodra)*, які з'яўляецца сітуатыўным эквівалентам, значэнне якога кіруецца дзеясловам.

## Заключэнне

Сіні колер ні ў беларускай, ні ў чэшскай фразеалогіі не займае дамінуючую пазіцыю. Фразеалагічных адзнак з каларонімам *сіні* ў абедзвюх мовах вельмі мала, яны не ўтвараюць антанімічных сэнсавых апазіцый, але зрэдку сустракаюцца ў фразеалагічнай сінаніміі. У такіх выпадках сінонімам да сіняга колеру выступае чорны. Магчыма, такую фразеалагічную „аморфнасць” гэтага колеру можна выводзіць з агульнай характарыстыкі яго псіхалагічнага ўздзеяння, сфармуляваную тэарэтыкамі мастацтва. Паводле Ёганнэса Іттэна, сіні колер заўсёды пасіўны – калі разглядаецца з пункту гледжання матэрыяльнай прасторы, з пункту гледжання духоўнай нематэрыяльнасці, наадварот, сіні прадукуе актыўнае ўражанне.

> Сіні колер быццам сціснуты і засяроджаны ў сабе, ён інтравертны. Калі чырвоны падпарадкаваны крыві, то сіні падначалены нервам. (…) Сіні колер валодае сілай, падобнай сілам прыроды зімой, калі ўсё, скрытае ў цемры і цішыні, копіць энэргію для зараджэння і росту. Сіні заўсёды стварае ўражанне ценю, а на піку сваёй велічы ён імкнецца да цемры. Сіні – гэта няўлоўнае нішто, якое ўсё ж пастаянна прысутнічае як празрастая атмасфера. У зямной атмасферы сіні колер разліты, пачынаючы ад святлейшай нябеснай лазуры да найглыбейшай сіняй чарнаты начного неба. Сіні прыцягвае нас пяшчотнасцю веры ў бясконцую духоўнасць. Для нас сіні колер – сімвал веры, як для кітайцаў ён – сімвал несмяротнасці. (…) гэты колер заўсёды ўказвае шлях да звышпачуццёва-духоўнага, трансцэндэнтнага (Itten, 2014, s. 161).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



Назіранні над развіццём фразеалагічнай семантыкі сіняга колеру пацвярджаюць ідэю семантычнай амбівалентнасці любога колеру, выказаную мастацтвазнаўцамі.

Разгледжаныя ФА сведчаць пра тое, што выяўленчы патэнцыял сіняга колеру ў абедзвюх мовах не адносіцца да актыўных, у агульнай масе ФА з сінімі каларонімамі ў чэшскай і беларускай мовах пераважаюць устарэлыя. Фразеалагічныя інавацыі не вызначаюцца вялікай частотнасцю, але адлюстроўваюць істотныя для сучаснага грамадства з'явы.

ФА, у якіх каларонім *сіні* адлюстроўвае прамое значэнне, азначаюць з'явы ці прадметы сіняга ці блакітнага колеру, гэта часцей назіраецца ў параўнаннях (*як неба, як васількі*), у такім кантэксце сіні колер перадае ўзнёслыя пачуцці, а яго семантыка ўпісваецца ў шкалу галоўнага для сіне-блакітнага спектру агульнага сімвалічнага значэння – 'мір'.

ФА, у якіх каларонім *сіні* падлег працэсу метафарызацыі, адлюстроўваюць сацыяльныя змены, творцам якіх выступае чалавек. З аднаго боку, у гэтых з'яў „прыглушаны" тон – яны нібы твораць ўнісон асноўнай характарыстыцы сіняга колеру, а з другога боку, азначаныя сінім колерам падзеі з'яўляюцца вынікам псіхалагічнай працы чалавека. У адрозненне ад натуральных з'яў і станаў прыроды, семантычна звязаныя з чалавекам метафары перадаюць завуаляваны сэнс, тэндэнцыю імкнення да цені, ці дакладней – да суседняга па шкале чорнага колеру. Калі прыродны *сіні/блакітны* звязаны з верай, духоўнасцю, марамі і мірным небам – абагуленым імкненнем да высокага, чыстага, то створаны чалавекам фразеалагічны „сіні скафандр" прыхоўвае сапраўдныя пачуцці чалавека і фіксуе (1) холад, (2) імкненне ўпарта трымацца свайго. Нездарма выраз *да пасінення* адлюстроўвае энергію напружання праз саматычныя кампаненты *рукі* і *пальцы*, якія даюць імпульс для асацыяцый *трымацца да апошняга*, а ў сучасным беларускім палітычным кантэксце – 'трымацца за ўладу'.

Прыметнікі са значэннем колеру запаўняюць не толькі ядро фразеалагічнага запасу кожнай мовы, але апошнім часам надзвычай актыўна „акупуюць" фразеалагічную перыферыю. Сіні колер дапаўняе фразеалагічную перыферыю адзінкамі *дзеці індзіга – indigové děti,* чэшская мова карыстаецца калькай з англійскай *modrá lež.*

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

**Dictionaries / Słowniki**

**BNK**: *Belaruskì N-korpus*. [*Беларускі N-корпус*. Рэжым доступа: http://bnkorpus.info].
**ČBFS:** Kalita, Inna. (2017). *Česko-běloruský frazeologický slovník*. Ústí nad Labem: UJEP, 2017.
**ČNK:** *Český národní korpus*. Рэжым доступа: https://www.korpus.cz
**ČNSKott:** Kott, František. (1878–1893). *Česko-německý slovník Fr. Št. Kotta* (on-line). Ústav pro jazyk český. Akademie věd ČR. Рэжым доступа: http://kott.ujc.cas.cz

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



**ESF:** Lepešaŭ, Ìvan. (2004). *Ètymalagìčny sloŭnìk frazealagìzmaŭ*. Mìnsk: Belèn]. [Лепешаў, Іван (2004). *Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў*. Мінск: БелЭн].

**LR:** Zaorálek, Jaroslav. (2009). *Lidová rčení*. Praha: Nakladatelství Československé akademie věd.

**SBNP:** Valodzìna, Taccâna; Salavej, Lìâ. (2011). *Sloŭnìk belaruskih narodnyh paraŭnannâŭ.* Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Валодзіна, Таццяна; Салавей, Лія. (2011). *Слоўнік беларускіх народных параўнанняў.* Мінск: Беларуская навука].

**SČFI-P**: Čermák, František, Hronek, Jiří, Machač, Jan. (1983). *Slovník české frazeologie a idiomatiky*. *Přirovnání*. Praha: Academia.

**SČFI-VN:** Čermák, František; Hronek, Jiří; Machač, Jan. (1988). *Slovník české frazeologie a idiomatiky. Výrazy neslovesné*. Praha: Academia.

**SČFI-VS-A-P:** Čermák, František; Hronek, Jiří; Machač, Jan. (1994). *Slovník české frazeologie a idiomatiky. Výrazy slovesné* A – P. Praha: Academia.

**SČFI-VV:** Čermák, František; Holub, Jan; Blatná, Renata; Kopřivová, Marie. (2009). *Slovník české frazeologie a idiomatiky. Výrazy větné*. Praha: Leda.

**SF-L:** Lepešaŭ, Ìvan. (2008). *Sloŭnìk frazealagìzmaŭ: u 2 t.* Mìnsk: Belaruskaâ èncyklapedyâ ìmâ P. Broŭkì. [Лепешаў, Іван (2008). *Слоўнік фразеалагізмаў*: *у 2 т*. Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі].

**SSJČ-online:** *Slovník spisovného jazyka českého* (on-line). (2011). Bohuslav Havránek (ed.). Za vedení B. Havránka, J. Běliče, M. Helcla a A. Jedličky zpracoval lexikografickýkolektiv Ústavu pro jazyk český ČSAV: V. Červená, J. Filipec, F. Havlová, M. Churavý, L. Janský, K. Kozlová, L. Kroupová, J. Machač, H. Marešová, V. Mejstřík, E. Michálek, B. Papírníková, E. Pokorná, B. Poštolková, M. Roudný, Z. Sochová, N. Svozilová, E. Vodrážková, J. Zima. Рэжым доступа: http://ssjc.ujc.cas.cz/search.php?db=ssjc

**Sources / Źródła**

Âkìmovìč, Alâksej. (2017). Šylʹdačka, alʹbo Zakon, âkì ne pracue. *Gazeta* Slonìmskaâ, 15.10.2017. [Якімовіч, Аляксей. (2017). Шыльдачка, альбо Закон, які не працуе. *Газета* Слонімская, 15.10.2017]. Рэжым доступа: https://www.gs.by/2017/10/15/shyldachka-albo-zakon-yaki-ne-pratsue/ (доступ: 23.09.2020).

Genìûš, Larysa. (1967). *Nevadam zʹ Nëmana*. Mìnsk: Belarusʹ. [Геніюш, Ларыса (1967). *Невадам зь Нёмана*. Мінск: Беларусь].

Honzák, Radkin. (2017). *Referendum jako jistá cesta do pekel*, 26.5.2017. Рэжым доступа: https://neovlivni.cz/esej-radkina-honzaka-referendum-jako-jista-cesta-do-ekel/ (доступ: 23.09.2020).

Honzák, Radkin. (2019). *Dnes není tendence dosahovat spravedlnosti, ale ohýbat pravidla* (…), 1.01.2019. iROZHLAS.cz. Рэжым доступа: https://www.irozhlas.cz/zpravy-domov/radkin-honzak-spravedlnost-ohybani-pravidel-psychiatr-elity-moudra-lez_1901012058_cen (доступ: 3.09.2020).

IA REGNUM. (2019). *Parlament Belorussii – dekorativnyj organ: «glavnaâ rolʹ» u Lukašenko*, 18.11.2019. IA REGNUM. [ИА REGNUM. (2019). *Парламент Белоруссии – декоративный орган: «главная роль» у Лукашенко,* 18.11.2019. ИА REGNUM]. Рэжым доступа: https://regnum.ru/news/polit/2781346.html (доступ: 23.09.2020).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



Naprawa, Amanda. (2017). *What Are 'Blue Lies'*? 1.05.2017. Рэжым доступа: (доступ:23.09.2020).

Novák, Tomáš. (2019). *Modrá lež – barva manipulace,* 8.07.2019. Рэжым доступа: (доступ: 23.09.2020).

Piróg, Mirosław. (2019). *O niebieskich kłamstwach*. TARAKA, 13.01.2019. Рэжым доступа: http://www.taraka.pl/o_niebieskich_klamstwach (доступ: 23.09.2020).

Radio Svoboda. (2019). *Na parlamentskih vyborah v Belorussii âvka bolee 70 procentov,* 17.11.2019. Radio Svoboda. [Радио Свобода (2019). *На парламентских выборах в Белоруссии явка более 70 процентов,* 17.11.2019. Радио Свобода]. Рэжым доступа: https://www.svoboda.org/a/ 30276793.html (доступ: 23.09.2020).

RBK. (2020). *Lukašenko «garantiroval», čto Putin ne ostanetsâ prezidentom do 2036 goda*, 6.08.2020. [РБК (2020). *Лукашенко «гарантировал», что Путин не останется президентом до 2036 года,* 6.08.2020. Рэжым доступа: https://www.rbc.ru/politics/06/08/2020/5f2c256c9a794 7e8ea891d41 (доступ: 23.09.2020)].

segodnya.ua. (2014). *Lukašenko zaâvil, čto ne budet deržat'sâ za kreslo prezidenta do posineniâ,* 30.12.2014. [segodnya.ua. (2014). *Лукашенко заявил, что не будет держаться за кресло президента до посинения,* 30.12.2014]. Рэжым доступа: https://www.segodnya.ua/world/lukashenko-zayavil-chto-ne-budet-derzhatsya-za-kreslo-prezidenta-do-posineniya-581288.html (доступ: 23.09.2020).

tvr.by. (2017). *U Pekìne Alâksandr Lukašènka voz'me ŭdzel u forume mìžnarodnaga supracoйnìctva (...),* 13.05.2017. [tvr.by. (2017). *У Пекіне Аляксандр Лукашэнка возьме ўдзел у форуме міжнароднага супрацоўніцтва (...),* 13.05.2017]. Рэжым доступа: https://www.tvr.by/bel/news/prezident/v_pekine_aleksandr_lukashenko_primet_uchastie_v_forume_mezhdunarodnogo_sotrudnichestva_odin_poyas_i_/ (доступ: 23.09.2020).

Zakonnìkaŭ, Sârgej. (2019). *Pagonâ za pìâram,* 31.01.2019. [Законнікаў, Сяргей. (2019). *Пагоня за піярам,* 31.01.2019]. Рэжым доступа: http://www.sn-plus.com/ru/page/viewpoint/9136/ (доступ: 23.09.2020).

**Studies / Opracowania**

Itten, Iohannes. (2014). *Iskusstvo cveta* (è-knìga). [Иттен, Иоханнес. (2014). *Искусство цвета*. (э-кніга)]. Рэжым доступа: https://vkist.ru/kniga-ittena-iskusstvo-cveta/index11.pdf (доступ: 7.09.2020).

Kalita, Inna. (2016). *Očerki po komparativnoj frazeologii. Seraâ palitra v nacional'nyh kartinah mira russkih, belarusov i čehov*. Moskva: Diksi Press. [Калита, Инна. (2016). *Очерки по компаративной фразеологии. Серая палитра в национальных картинах мира русских, беларусов и чехов*. Москва: Дикси Пресс].

Kalita, Inna. (2017). *Očerki po komparativnoj frazeologii II. Cvetnaâ palitra v nacional'nyh kartinah mira russkih, belarusov, ukraincev i čehov*. Ústí nad Labem: PF UJEP. [Калита, Инна. (2017). *Очерки по компаративной фразеологии II. Цветная палитра в национальных картинах мира русских, беларусов, украинцев и чехов*. Ústí nad Labem: PF UJEP].

Mokienko, Valerij. (2019). *Slavânskoe i neslavânskoe v slavânskoj frazeologii*. U: *SLAVOFRAZ 2018: Frazeologija, učenie i poučavanie* (s. 223–233). Rijeka: Sveučilište u Rijeci.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 08/05/2026 19:48:26



[Мокиенко, Валерий. (2019). *Славянское и неславянское в славянской фразеологии*. У: *SLAVOFRAZ 2018: Frazeologija, učenje i poučavanje* (с. 223–233). Rijeka: Sveučilište u Rijeci].

Sadoǔskaâ, Anžalìka. (2018). Kalaronìmy ǔ frazealagìčnym kantèksce. W: Mìkalaj Prygodzìč (rèd.). *Belaruskae slova: tèrmìn ì vobraz: zbornìk artykulaǔ pa matèryâlah navukovyh čytannâǔ, prysvečanyh pamâcì prafesara V.P. Krasneâ* (s. 150–159). Mìnsk: BDU. [Садоўская, Анжаліка. (2018). Каларонімы ў фразеалагічным кантэксце. У: Мікалай Прыгодзіч (рэд.). *Беларускае слова: тэрмін і вобраз: зборнік артыкулаў па матэрыялах навуковых чытанняў, прысвечаных памяці прафесара В. П. Краснея* (с. 150–159). Мінск: БДУ].

SUBMITTED: 01.10.2020
ACCEPTED: 31.03.2021
PUBLISHED ONLINE: 12.12.2021

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Inna Kalita / Іна Каліта** – Czechy, Uście nad Łabą, Uniwersytet Jana Ewengelisty Purkine, Katedra Bohemistyki; dr; spec.: filologia słowiańska (językoznawstwo i literaturoznawstwo), zainteresowania naukowe: komparatystyka, metodyka nauczania, język rosyjski jako język obcy, komunikacja międzykulturowa, socjolingwistyka, lingwokulturologia, frazeologia.

Adres: Katedra bohemistiky a slavistiky, Pedagogická fakulta, Univerzita Jana Evangelisty Purkyně, Králova výšina 3132/7, 400 96 Ústí nad Labem, Česká republika

Wybrane publikacje:

1. Inna Kalita. (2017). *Česko-běloruský frazeologický slovník*, Ústí nad Labem: PF UJEP.
2. Inna Kalita. (2017). *Очерки по компаративной фразеологии II. Цветная палитра в национальных картинах мира русских, беларусов, украинцев и чехов*. Ústí nad Labem: PF UJEP.
3. Инна Калита. (2013). *Стилистические трансформации русских субстандартов, или книга о сленге*. Москва: Дикси Пресс.
4. Инна Калита. (2012). Основы межкультурной коммуникации. Знакомство с постсоветскими государствами Ústí nad Labem: Univerzita J. E. Purkyně.
5. Инна Калита. (2010). *Современная Беларусь: языки и национальная идентичность*. Ústí nad Labem: PF UJEP.